# Першы сьнег.

*Холоднай пабелай магільна залег*
*На зжатае поле, на скошаны лог.*

*Лег пухам на лесе, на жоўтых лісьцях,*
*Абсеяў, абсыпаў прысады і шлях.*

*Так высыпаў зьзябна, бязрадасна сьнег*
*У першы папас свой, у першы начлег.*

*Ад стада адбіўшыся птушка адна*
*Квіліць і квіліць сярод бела радна.*

*На небе на сьнежным ні сонца, ні зор,*
*На гонях на сьнежных ні груд ні разор.*

*Абсьнежаны сьвет без канца, бяз граніц,*
*Душа адно тлее, як сьвечка з граміц*

*На хаце за хатай махнаціцца бель,*
*На белі за тынам, як нітка з кудзель,*

*Чырвоная йстужка скрозь бель зіхаціць,*
*І ў сажаўцы губіць свой сьлед гэта ніць.*

*Ад раньня скараньнем бурліць варажба:*
*Што знача такі сьлед, такая хадзьба?*

*Хто сьмеў першы сьнег асьвяціці крывей?*
*Крывавай ен веры, чужы ен, ці свой?*

*Дагадка шыбае ў лядзянай імгле;*
*Паўзе і прысуд-перасуд па сяле.*

*На полі на бледным сноўе бледны цень,*
*А птушка квіліць і квіліць цэлы дзень...*

*У гэты сьнег першы брат брата засек*
*І ў сажаўку трупа валок цераз сьнег.*

**Янка Купала.**

Смаленск 20/XI—18 г.